пабудове культуры міру[5]. "Культура міру" — гэта вельмі шырокае паняцце. Яго ўкараненне ў грамадскую свядомасць спрыяе "падаўленню агрэсіўнасці сярод людзей, змене сацыяльных арыенціраў ад вайны да міру, ад псіхалогіі насілля да псіхалогіі згоды і талерантнасці"[6]. Не трэба думаць, што гэта адбудзецца хутка. Вельмі трывалыя былыя стэрэатыпы, на якіх было не адно пакаленне людзей. Задача музеяў сёння — "інфармаванне насельніцтва аб перавагах адкрытага ўстойлівага грамадства, аб сутнасці і значэнні культуры міру і міратворчай дзейнасці, аб гармоніі і мірным суіснаванні розных культур, этнасаў, нацый, рэлігій"[7].

З дапамогай музейных экспазіцый, культурна-адукацыйных праграм, іншых форм і метадаў музеі раскрываюць розныя бакі чалавечых адносін, прымушаюць наведвальніка задумацца над многімі балючымі праблемамі мінулага і сучаснага, вайны і міру.

Выхаванне сучаснай моладзі на прыкладах гісторыі, далучэнне іх да вопыту папярэдніх пакаленняў — гарантыя таго, што патрыятызм стане нормай нашага грамадства, што традыцыйныя паняцці гонару, годнасці, абавязку стануць прыярытэтнымі для большасці беларусаў.

---

[1] *Беляев В. И., Мухин М. И.* Концептуальные основы педагогики национальной школы // Адукацыя і выхаванне. 2001. № 4. С. 33.

[2] Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Беларусі // Адукацыя і выхаванне. 1993 № 12. С. 130.

[3] *Воронкова И. Ю.* Экспозиционная работа Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны: Традиции, современность, перспективы // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. // Нац. б-ка Беларусі. 2000. Вып. 5. С. 17.

[4] *Даффи Т.* Концепция музея мира // Museum. 1993. № 177. С. 4—8.

[5] Рекомендации о воспитании в духе международного взаимопонимания, сотрудничества и мира и в духе уважения прав человека и основных свобод (19 ноября 1974 года) // Свод нормативных актов ЮНЕСКО. М., 1991. С. 138—143.

[6] *Сташкевіч А. Б.* Музей за мір і гармонію // Культура. 2000. 20—26 мая (№ 19—20). С. 4.

[7] Тамсама.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***В. У. Міронч****ык* *(Мінск),*
*прарэктар па навуковай рабоце БелДІПК*

# ШЛЯХІ СТАНАЎЛЕННЯ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў БЕЛАРУСІ

У апошнія гады ў сувязі з агульнай дэмакратызацыяй культурнага жыцця ў айчыннай музейнай справе актыўна ставяцца тэарэтычныя праблемы, узрастае неабходнасць даследаванняў, звязаных з абнаўленнем паняційнага апарату. Значную цікавасць у сувязі з гэтым прадстаўляе гісторыя станаўлення новага для беларускіх спецыялістаў паняцця "музейная педагогіка", запазычанага ў нямецкім музеязнаўстве.

Дэфініцыя "музейная педагогіка" пачала ўжывацца ў Беларусі ў 80—90-я гады і абазначыла як практычную дзейнасць музеяў, так і новую навуковую дысцыпліну. Пры гэтым культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў стала разглядацца з пазіцый максімальнага ўліку асаблівасцей аўдыторыі (яе ўзроставых, сацыяльных, адукацыйных і іншых характарыстык), а таксама камунікатыўнага падыходу да наведвальнікаў як раўнапраўных удзельнікаў дыялога, якія ажыццяўляецца ў музейным асяроддзі. Прадметам даследавання новай навуковай дысцыпліны сталі адукацыйныя аспекты музейнай камунікацыі.

Можна выдзеліць некалькі этапаў, якія характарызуюць эвалюцыю музейнай педагогікі.

1. 1880—1920-я гады — грамадскае прызнанне музея ў якасці адукацыйнага інстытута, станаўленне асаблівага накірунку дзейнасці музеяў, які звязаны з работай з наведвальнікамі.

2. 1930-я — пачатак 1940-х гадоў — час, калі тэорыя і практыка музейнай педагогікі ўзбагачалася канцэпцыямі ўзаемадзеяння музея і школы.

3. 1960—1990-я гады — фарміраванне музейнай педагогікі ў якасці навуковай дысцыпліны.

Аналіз даступнай літаратуры дазваляе зрабіць вывад, што асноўным фактарам станаўлення адукацыйнай функцыі музея сталі крызісныя з'явы ў сістэме школьнай адукацыі канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Асноўнымі шляхамі выхаду школы з крызісу педагогі-рэфарматары таго часу лічылі ўзмацненне прадметнага метаду выкладання, развіццё творчай актыўнасці навучэнцаў і паглыбленне сувязі навучання з жыццёвым вопытам дзяцей.

Вядучым прынцыпам пераўтварэнняў сталі нагляднасць навучання і шырокае азнаямленне навучэнцаў з навакольным светам. Пад уплывам гэтых тэндэнцый выявіўся новы погляд на адукацыйнае прызначэнне музеяў. Яны сталі разглядацца як самастойныя адукацыйныя установы, а музейны метад атрымаў шырокае выкарыстанне ў школьнай практыцы.

Напачатку XX стагоддзя ў Беларусі паступова фарміруецца сетка музеяў — вучэбных, школьных, педагагічных, — для якіх адукацыйныя задачы становяцца асноўнымі. У той жа час у многіх еўрапейскіх краінах распаўсюджвалася тэорыя пазашкольнай адукацыі. Галоўная яе ідэя заключалася ў арганізацыі культурна-асветніцкай работы сярод дарослага насельніцтва. Важную ролю ў гэтым, дзякуючы нагляднасці і эмацыянальнасці ўспрымання, ігралі музеі.

Царкоўна-археалагічныя музеі, музеі пры навуковых таварыствах і земствах Беларусі, гарадскія музеі, музеі агульнаадукацыйныя і педагагічныя ў Мінску, Віцебску, Гродна, Магілёве і іншых гарадах пачалі актыўна працаваць з публікай. Стваральнікі гэтых музеяў былі ўпэўнены, што няма такой сферы жыцця прыроды і чалавека, з якой публіка не хацела б пазнаёміцца ў музеі[1].

Вялікі ўплыў на ўкараненне сталай сістэматычнай работы з наведвальнікамі ў музеі меў шырокі экскурсійны рух, які на мяжы стагоддзяў ахапіў многія еўрапейскія краіны. Сістэматычныя музейныя экскурсіі ў Беларусі сталі ўпершыню арганізоўваць не толькі для навучэнцаў і педагогаў, але, у значнай ступені, і для працоўных мас, чаму спрыялі бясплатны ўваход, праца ў выхадныя дні, тлумачэнні, якія даваліся падчас агляду. Музей ахвотна наведвалі рабочыя і сяляне, мелкія служачыя, ваенныя.

Важным этапам на шляху прызнання работы з наведвальнікамі ў якасці самастойнага накірунку дзейнасці музеяў сталі канферэнцыя "Музеі як адукацыйныя і выхаваўчыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстановы" (Мангейм, Германія, 1913 г.) і Расійскі папярэдні музейны з'езд (С.-Пецярбург, Расія, 1912 г.). Гэтыя форумы заклалі першы камень у падмурак музейнай педагогікі, упершыню сфармулявалі надзённыя задачы музеяў, у першую чаргу адукацыйныя. А нямецкі педагог-рэфарматар і музейны дзеяч А. Ліхтварк (1852—1914) назваў музеі новымі адукацыйнымі інстытутамі, якія разам з акадэміямі і універсітэтамі павінны аказваць непасрэдны ўплыў на выхаванне ўсіх пластоў грамадства[2].

Водгукі гэтых форумаў знайшлі сваё практычнае ўвасабленне ў беларускіх музеях. Актыўная работа музейных работнікаў з працоўнымі масамі на гісторыка-археалагічных і агульнанавуковых экспазіцыях, пабудаваных на беларускім матэрыяле, аб'ектыўна садзейнічала распаўсюджванню ведаў, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці. Пошукі ж айчынных музейных дзеячаў першых паслярэвалюцыйных гадоў у галіне педагогікі музейнай экспазіцыі зводзіліся, у асноўным, к прыстасаванню музеяў да асаблівасцей новых наведвальнікаў — малапісьменных рабочых і сялян, а ў выніку — да прымітывізацыі выставачнай і асветніцкай работы, музейнага лікбезу.

Змены палітычнай сітуацыі ў 1930-х гадах моцна паўплывалі на адукацыйную канцэпцыю музеяў. Аналіз крыніц паказаў, што для выканання пастаўленых савецкай дзяржавай задач ідэалагічныя органы Беларусі вакарыстоўвалі аднолькавыя прыёмы, якія нічым не адрозніваліся ад тых, якія прымяняліся ў Маскве, ці іншых савецкіх рэспубліках: барацьба за павышэнне наведванняў музеяў, іх удзел у дзяржаўных ідэалагічных кампаніях, павышэнне ролі работы са школай.

Асаблівую ўвагу дзяржава ўдзяляла краязнаўчым музеям, лічачы іх галоўнымі сярод іншых. Іх асноўнымі задачамі сталі цяпер згуртаванне савецкага народа, выхаванне грамадзян барацьбітамі за інтарэсы дзяржавы. Аднак арыентацыя на выкананне чыста прапагандысцкіх задач з'явілася прычынай іх нівеліравання, стварэння "скалькіраваных" экспазіцый.

Прыярытэтным накірункам дзейнасці музеяў 1930-х гадах становіцца работа з настаўнікамі і вучнямі. Музей павінен быў аказваць дапамогу школьнаму педагогу, арганізоўваючы цыклы лекцый і экскурсій. Менавіта ў гэты час сфарміравалася "школацэнтрысцкая" тэорыя падначалення дзейнасці музея патрэбам школы.

Напачатку 1960-х гадоў у сувязі з рэформамі ў галіне адукацыі зноў было пастаўлена пытанне аб неабходнасці выкарыстання багатага адукацыйнага патэнцыялу музеяў. Упершыню ў савецкай музейнай літаратуры пачынае ўжывацца запазычаны з Германіі тэрмін "музейная педагогіка," да сферы кампетэнцыі якой сталі адносіць не толькі супрацоўніцтва з адукацыйнымі ўстановамі, але і работу з усімі музейнымі наведвальнікамі[3]. Востра ставіцца пытанне аб дыферынцыраваным падыходзе да музейнай публікі. Нягледзячы на складанасці, выкліканыя неабходнасцю работы ў рэжыме "музейнага бума", з'яўляюцца першыя музейныя педагогі-наватары, якія пачынаюць выпрацоўваць свае падыходы спачатку да экскурсійнай дзейнасці ў музеі, а пасля і свае ўласныя методыкі.

У 1970—80-я гады многія беларускія музеі актыўна пашыраюць спектр форм работы са сваімі наведвальнікамі. Пачынаюць з'яўляцца першыя аддзелы музейнай педагогікі ў буйных беларускіх музеях. Музейна-педагагічны занятак стаў звыклай формай работы з дзецьмі. Актыўна пачала развівацца работа з іншымі катэгорыямі музейнай аўдыторыі.

Такім чынам, да пачатку 1990-х гадоў музейная педагогіка заваявала

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

трывалае становішча і стала аказваць уплыў на ўсе бакі музейнай адзейнасці. Адбылася канчатковая адмова ад вузкай трактоўкі музейнай педагогікі як выкарыстання музея ў мэтах навучання. Распачалася распрацоўка тэарэтычных асноў новай навуковай дысцыпліны. Пра гэта сведчыць вялікая цікавасць музейных работнікаў да расійскіх і нямецкіх музейна-педагагічных абагульненняў. Беларускія музейныя педагогі становяцца сябрамі буйных расійскіх музейна-педагагічных цэнтраў: Творчай лабараторыі "Музейная педагогіка" кафедры музейнай справы Акадэміі перападрыхтоўкі работнікаў мастацтва, культуры і турызму; Расійскага цэнтра музейнай педагогікі і дзіцячай творчасці Дзяржаўнага Рускага музея; штогадовага семінара "Музей і падрастаючае пакаленне" і іншых. Удзел у шматлікіх міжнародных канферэнцыях па музейна-педагагічнай праблематыцы спрыяў распаўсюджванню тэарэтычнах распрацовак і практычнага вопыту калег з Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, ЗША. А з 1995 года пачынае сваю работу першы ўласна беларускі музейна-педагагічны цэнтр — пастаянна дзеючы семінар музейных педагогаў Беларусі на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. З'явіліся першыя навуковыя і навукова-метадычныя артыкулы і нават зборнікі са спробамі тэарэтычных абагульненняў. Музейная педагогіка становіцца адной з асноўных дысцыплін, якія выкладаюцца ў ВНУ для будучых музейных спецыялістаў, і, як вынік, з'яўляюцца курсавыя і дыпломныя работы па розных аспектах музейнай педагогікі, а таксама першыя дысертацыі па музейна-педагагічнай праблематыцы.

Цікавасць да музейнай аўдыторыі сталі актыўна праяўляць і сацыёлагі. За апошнія гады з'явіліся даследаванні як комплексныя, усебеларускія, так і накіраваныя на вывучэнне аўдыторыі канкрэтнага музея[4].

Сёння музейная педагогіка актыўна развіваецца ў абодвух накірунках: і як накірунак дзейнасці музея, і як новая навуковая дысцыпліна. Асноўнай яе задачай бачыцца стварэнне найбольш прыдатных умоў для зносін наведвальніка з музейным прадметам. Гэта значыць:

— прадастаўленне магчымасці кожнаму наведвальніку музея засвоіць музейную інфармацыю ў адпаведнасці з яго ўзростам, адукацыяй, жаданнямі і звычкамі. Музейны педагог выступае ў якасці пасрэдніка ў зносінах наведвальніка з музейнымі каштоўнасцямі, а наведвальнік успрымаецца як актыўны ўдзельнік музейнага дыялога;

— актывізацыя пазнавальнай дзейнасці музейных наведвальнікаў, выхаванне неабходных навыкаў самастойнай работы з музейным прадметам, развіццё іх крэатыўнасці;

— улік сацыяльна-дэмаграфічных фактараў, матывацыі музейнага наведвання, псіхафізічнага стану, рэлігійнай прыналежнасці, маёмаснага стану і інш.

Аднак варта адзначыць, што на практыцы беларуская музейная педагогіка нярэдка ўспрымаецца пераважна як "дзіцячы" накірунак дзейнасці музея, што, безумоўна, звужае спектр яе задач.

---

[1] *Гужалоўскі А. А.* Нараджэнне беларускага музея. Мн., 2001.

[2] *Юхневич М. Ю.* Я поведу тебя в музей. М., 2001. С. 7.

[3] *Медведева Е. Б., Юхневич М. Ю.* Музейная педагогика как новая научная дисциплина //Культурно-образовательная деятельность музеев. М., 1997. С. 17—25.

[4] Музей і наведвальнік: Сацыялагічнае даследаванне (на базе Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь). Мн., БелІПК, 2000. — 52 с.; Комплекснае сацыялагічнае даследаванне работы музея з аўдыторыяй: Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навук.-інфарм. зб. Вып. 1 / Нац. б-ка Беларусі. Мн., 2000. — 108 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ